


## У НУМАРЫ


| **_Навіны_** | **_Навуковая праца_** |
|---|---|
| **Мінскі раён: адбіткі культурнай разнастайнасці** | **Заслаўе ў беларускай культуры** |
| **Музейны клуб як асаблівая форма арганізацыі працы ў музейнай прасторы** | **Командиры героической пехоты: военные судьбы командиров полков 64-й стрелковой дивизии** |
| **Сустрэча з архітэктарам-рэстаўратарам** | |


## _Навіны_

### Мінскі раён: адбіткі культурнай разнастайнасці

15 лістапада ў Музей-запаведнік завіталі супрацоўнікі галіны культуры Мінскага раёна. Імі была наведана “Хата завозніка” (этнаграфічны комплекс), Музей беларускай маляванкі і Музейна-выставачны комплекс, дзе рабілася фота-відэаздымка, па аўтарскім чынам прадуманай пастаноўцы.

Нашы госці мелі на мэце стварыць візуалізаванае ўвасабленне культурнай разнастайнасці Мінскага раёна, у тым ліку – уключыць у гэта ўвасабленне і прастору Музея-запаведніка як прастору асаблівай установы культуры Мінскага раёна. У згаданай вышэй справе ім аказвалі дапамогу нашы супрацоўніцы: Інэса Сабалеўская, Святлана Гайдукевіч, Алена Пакінка, Алена Рак, Ірына Арцем'ева, Алена Старавойтава.

Так, напрыклад, у “Хаце завозніка” здымаўся відэасюжэт пра дзяцінства Алены Кіш, для чаго з калекцыі музея быў падабраны арыгінальны маляваны дыван 1920-х гг. з раслінна-арнаментальным сюжэтам. Інтэр'ер аб'екта надаваў сюжэту каларыт арыгінальнасці і сапраўднасці, простага сялянскага побыту. Добрыя кадры атрымаліся ў

нашых гасцей і ў Музеі беларускай маляванкі, а таксама – у Музейна-выставачным комплексе.



*Госці ў Музеі беларускай маляванкі. Аўтар фота – С. Гайдукевіч*



*Госці ў Музеі беларускай маляванкі. Аўтар фота – С. Гайдукевіч*

Прыемна, што Музей-запаведнік знайшоў сваё адлюстраванне ў агульным прадстаўленні культурнай разнастайнасці Мінскага раёна.

Відэаролік, які быў зняты ў экспазіцыях Музея-запаведніка, стаў яскравым суправаджэннем кампазіцыі “Песня аб райскім жыцці”, выкананай аб’яднаннем з удзельнікаў народнага ансамбля інструментальнай музыкі “Каданс” Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў, фальклорнага калектыва “Покліч” Мачулішчанскага цэнтра культуры і вольнага часу, харэаграфічнага ансамбля “Линии” Траскаўшчынскага Дома культуры Мінскага раёна падчас XIX абласнога фестываля “Напеў зямлі маёй” (г. Барысаў).




*Кампазіцыя “Песня аб райскім жыцці”,*
*XIX-ы абласны фестываль “Напеў зямлі маёй” (г. Барысаў)*

Дарэчы, выступоўцы сталі лепшымі ў намінацыі “За творчае ўвасабленне гістарычнай тэматыкі”, магчыма, у тым ліку і дзякуючы таму ўнёску, які робіць Музей-запаведнік у захаванне гістарычнай і культурнай спадчыны, яе трансляцыю сродкамі музейнай экспазіцыі.

Запрашаем да супрацы і ў будучым: з задавальненнем акажам са свайго боку ўсю патрэбную і магчымую дапамогу. Нагадваем, карыстаючыся нагодай, пра тое, што Музей-запаведнік можа быць самай markup рознабаковай базай для ўвасаблення культурных праектаў, бо мае шэраг рознапланавых аб'ектаў, кожны з якіх магчыма па-свойму абыграць і ўвасобіць.

## Музейны клуб як асаблівая форма арганізацыі працы ў музейнай прасторы

Музеі ў сучаснасці імкнуцца выкарыстоўваць самыя разнастайныя формы арганізацыі сваёй працы, каб быць больш прыцягальнымі для патэнцыяльных наведвальнікаў. У ліку гэтых форм можна ўзгадаць разнастайныя тэматычныя аб'яднанні на базе музея: гурткі, клубы, лабараторыі і іншыя.

Музей-запаведнік “Заслаўе” таксама імкнецца падтрымліваць разнастайнасць форм працы са сваёй аўдыторыяй (асабліва – з сямейнымі наведвальнікамі). З гэтай мэтай на яго базе быў утвораны сямейны клуб “Заслаўскія фарбы ў музеі”, кіраўніком якога з'яўляецца наша супрацоўніца, выдатная мастачка Анастасія Балыш.



*Занятак клуба, прысвечаны казачным персанажам – Красналюдкам. Справа ў чырвоным – Анастасія Балыш (фота са старонкі Анастасіі Балыш у “Facebook”)*

Заняткі клуба адбываюцца на базе Музея беларускай маляванкі кожны аўторак. Часам, дапамогу Анастасіі ў арганізацыі працы аказваюць і іншыя нашы супрацоўнікі, каб дадаць у агульную справу новыя “адценні” і сэнсы, вельмі патрэбныя для самых патрабавальных і самых удзячных нашых наведвальнікаў – для дзяцей.

Адбываецца чаргаванне заняткаў, тэарэтычных і практычных, – спачатку навуковыя супрацоўнікі знаёмяць наведвальнікаў з пэўнай з’явай, а праз тыдзень, на наступным занятку, адбываецца непасрэднае паглыбленне ў тэму рознымі мастацкімі сродкамі, што дазваляе наведвальнікам больш глыбока і дасканала пазнаёміцца з усім багаццем музейнай экспазіцыі і музейных фондаў.

Дзякуючы багатай фантазіі і вопыту творчай працы з дзецьмі, Анастасія стварае для нашых малых сяброў сапраўдную казку, у якой заўжды ёсць месца і для іх бацькоў, зацікаўленых развіццём сваіх дзяцей і магчымасцю ў ім паўдзельнічаць, магчымасцю проста і весела правесці час разам за стваральнай працай, з пэндзлем, фарбамі, алоўкамі... І гэта ўсё адбываецца непасрэдна ў музейнай прасторы, з яе актыўным выкарыстаннем у арганізацыі працэсу пазнання і творчасці.



*Занятак клуба, прысвечаны казачным персанажам – Красналюдкам (фота са старонкі Анастасіі Балыш у "Facebook")*



*Занятак клуба, прысвечаны казачным персанажам – Красналюдкам. Справа ў чырвоным – Анастасія Балыш (фота са старонкі Анастасіі Балыш у "Facebook")*

Трапіць у казку проста, калі ёсць каму яе стварыць. Выдатна, калі месцам жыцця гэтай казкі стае музей, калі ён адкрывае новыя грані ўзаемасувязі з наведвальнікамі. Мы шчыра ўдзячны Анастасіі Балыш за тое, што яна дапамагае ствараць гэту казку, нібы добрая фея, з пэндзлем замест чароўнай палачкі, заўсёдным запасам фарбаў, бадзёрасці і аптымізму.

Верым у далейшы поспех дадзенай працы і запрашаем на новыя сустрэчы!

## Сустрэча з архітэктарам-рэстаўратарам

У суботу, 25 лістапада, на этнаграфічным комплексе “Млын і Кузня” адбылася сустрэча з архітэктарам-рэстаўратарам Зміцерам Савельевым. Яна была запланавана для ўсіх ахвотных і зацікаўленых праблемай захавання архітэктурных аб'ектаў драўлянай гісторыка-культурнай спадчыны. Спецыяліст прачытаў лекцыю па тэме: “Аднаўленне драўляных канструкцый гістарычных збудаванняў”.



*За лекцыяй. Справа стаіць Зміцер Савельеў. Аўтар фота – Л. Дакука*

Прыемна, што заяўленая тэма выклікала ўвагу і спецыялістаў, і простых наведвальнікаў. Адмыслова на сустрэчу з архітэктарам прыехаў Францішак Жылка – чалавек, які ведае, што такое рэстаўрацыя, аднаўленне і выкарыстанне аб’ектаў спадчыны на ўласным вопыце. Спадар Францішак аднавіў вадзяны млын у аграгарадку Жодзішкі, якім валодаў дзед Францішка Баляслававіча па мацярынскай лініі ў першай палове мінулага стагоддзя.

Дзякуючы шматгадовым намаганням, сродкам і асабістай зацікаўленасці спадара Францішка вадзяны млын цяпер з’яўляецца культурна-вытворчым асяродкам. Акрамя таго, Францішак Баляслававіч з’яўляецца даследчыкам млынарства на тэрыторыі нашай краіны, вынікам яго шматгадовай працы сталі два выданні кніг “Млынарства ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць”.

Не вельмі лёгкай і “трэндавай” тэмай сустрэчы зацікавіўся паэт, празаік, перформер і аглядальнік газеты “Культура” – Ілля Сін. Асабістыя і прафесійныя інтарэсы якога супалі з тэмай сустрэчы і праблемамі, якія падымаліся падчас яе.

Значную ўвагу да дадзенага мерапрыемства праявілі нашы супрацоўнікі. На сустрэчы, з ліку музейных работнікаў, прысутнічалі: Алена Пакінка, Таццяна Арлова, Настасся Палягошка і Людміла Дакука. Вядома, што згаданая вышэй тэма з'яўляецца для нас асабліва актуальнай у кантэксце захавання будынкаў этнаграфічнага комплекса, які ўваходзіць у склад аб'ектаў Музея-запаведніка і з'яўляецца адным з найбольш прыцягальных для наведвальнікаў. Менавіта тут адбываецца асноўная колькасць музейных тэатралізаваных прадстаўленняў, а таксама экскурсій з элементамі тэатралізацыі.

Сустрэча са Зміцерам Савельевым адбылася ў “Хаце завознікаў” з той мэтай, каб атрымаць, праз уключанасць аўдыторыі ў яе арыгінальны інтэр'ер, непасрэднае ўвасабленне тэмы, прапанаванай да раскрыцця ў межах арганізаванай лекцыі. Па структуры выступлення стала адразу зразумела, што Зміцер Савельеў з'яўляецца практыкам, які акцэнтуе ўвагу аўдыторыі на канкрэтных момантах рэстаўрацыйных прац. Пасля асноўнай часткі выступлення, удзельнікі сустрэчы задалі выступоўцы свае пытанні, атрымаўшы на іх вычарпальныя і кампетэнтныя адказы.

## ***<u>Навуковая праца</u>***

### Заслаўе ў беларускай культуры

Заслаўе, у розных стагоддзях, уплывала на развіццё гісторыі і культуры Беларусі. Працягвае яно ўтвараць згаданы ўплыў, больш ці менш заўважны, і цяпер. Дзесьці гэта выяўляецца наўпроставым чынам, дзесьці – ускосным, падобна тонкай “нітачцы”. Прасочым адну з такіх “нітачак-сувязяў”, якая сягае ў старажытнасць і ідзе ад гістарычнай асобы, чыё імя па гэты час носіць Заслаўе (Ізяслаўль), – князя Ізяслава.

Князь Ізяслаў, колькі гадоў пажыўшы ў Ізяслаўлі, атрымаў дазвол ад свайго бацькі (Уладзіміра Святаславіча) на княжанне ў Полацку, куды і выправіўся. Тут у яго ўтварылася сям'я, нарадзіўся сын – Брачыслаў, які, стаўшы дарослым і самастойным, заснаваў у 1065 г. горад-крэпасць Брачыслаўль – сучасны Браслаў, вядомы ўсёй Беларусі, як сапраўдная перліна сярод маляўнічых азёраў.



*Помнік князю Ізяславу на Рынкавай плошчы ў Заслаўі*



*Макет Браслаўскага замка. Гістарычна-краязнаўчы музей Навукова-даследчай установы культуры “Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў”*

У Брачыслава быў сын Усяслаў, вядомы ў гістарыяграфіі як Усяслаў Чарадзей. Пры Усяславе Полацкае княства набыло асаблівую магутнасць. Пры ім быў збудаваны Сафійскі сабор, падобных якому больш нідзе не будавалася на беларускіх землях, з яго ж княжаннем звязана і першая згадка ў летапісах пад 1067 г. пра г. Мінск (старажытны Менск).

Усяслаў меў шмат спадкаемцаў – лёс падараваў яму многа сыноў. Адзін з іх, Рагвалод Барыс, вядомы тым, што ў 1102 г. заснаваў г. Барысаў, а таксама – пакінутымі па сабе вялізнымі камянямі з надпісамі, так званымі “Барысавымі камянямі”. Другі, Святаслаў Георгій, вядомы найбольш тым, што быў бацькам Прадславы, якая ў будучым стане найбольш вядомай і шанаванай беларускай святой – Еўфрасінняй Полацкай, уплыў якой на развіццё айчыннай гісторыі і культуры з'яўляецца вельмі значным і даўно прызнаны ўсімі.



*Барысаў камень каля Друі. Малюнак А. Сапунова, 1896 г.*




*Памятная манета з выявай Еўфрасінні Полацкай і Яе крыжа. НБРБ, 2001 г.*

Нашчадкі князя Ізяслава (Ізяславічы), як мы бачым нават з асобных згадак, прыведзеных вышэй, зрабілі каштоўны ўнёсак у скарбонку гісторыі і культуры Беларусі, а, значыць, у гэтым ёсць, хай і ўскосны, але заслаўскі след. Каб адчуць яго, трэба прыехаць у тыя мясціны, дзе калісьці жылі Ізяслаў і яго маці Рагнеда (Гарыслава, Анастасія), падняцца на вал старажытнага Ізяслаўля (гарадзішча “Замачак”/“Замэчак”), паглядзець з яго вышыні на заслаўскія святыні – Кафедральны сабор Праабражэння Гасподня і Парафіяльны касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі. Зараз гэта зрабіць асабліва зручна: лісце з дрэваў даўно апала, таму лёгка можна сягаць зацікаўленым вокам у вакольныя далягляды.

**Командиры героической пехоты:**
**военные судьбы командиров полков 64-й стрелковой дивизии**

В состав 64-й стрелковой дивизии, оборонявшей территорию Минщины совместно с рядом других дивизий в июне 1941 г., входили три

пехотных полка: 30-й, 159-й и 288-й. Каждый из данных полков возглавляли опытные кадровые офицеры Красной Армии. За плечами каждого из них, к примеру, был опыт Гражданской войны, а значит – непосредственный боевой опыт. Следует отметить также, что командир 159-го стрелкового полка участвовал и в боевых действиях советско-финской войны. Стаж службы в рядах Красной Армии на момент начала Великой Отечественной войны у каждого командира упомянутых выше полков составлял более 20-ти лет. Теперь обратимся непосредственно к именам.



*Командир 30-го стрелкового полка Ефремов А.И.*
*(фото с портала “Память народа”)*

Командиром 30-го стрелкового полка был полковник Ефремов Александр Иванович (1897 г.р.), 159-го – подполковник Белов Алексей Иванович (1899 г.р.), 288-го – подполковник Кучмистый Григорий Петрович (1898 г.р.). Все они вместе со своими полками прибыли в составе 64-й стрелковой дивизии на территорию Минщины в июне 1941 г. Затем дивизия получила приказ на занятие обороны, в которой каждый из полков получил свой ответственный участок.

Немцы появились в полосе обороны полков 25-го июня. Завязались тяжёлые бои, продолжавшиеся по 27-28 июня, в результате которых противник понёс ощутимые потери, однако и полки 64-й стрелковой дивизии, на которые обрушились мощные удары немцев, вынуждены были отступать, в том числе – прорывая кольца окружения.

В боях июня 1941 г. в Заславле погиб, поднимая своих бойцов в атаку, командир 159-го стрелкового полка Алексей Иванович Белов. Командир 30-го стрелкового полка умело вышел с группой своих бойцов из смыкаемого противником кольца окружения. Отступая с другими частями Красной Армии в восточном направлении, продолжал бить врага. Погиб Александр

Иванович Ефремов в сентябре 1941 г., в бою на территории Смоленщины. Командир 288-го стрелкового полка Григорий Петрович Кучмистый прорвался вместе со своими бойцами из кольца окружения противника, поучаствовал ещё во многих боях, в том числе – прошёл пекло сражений под Вязьмой, позднее стал начальником штаба 7-й Гвардейской стрелковой дивизии (бывшей 64-й стрелковой дивизии), затем – начальником штаба 7-й пехотной дивизии Войска Польского. Прошёл всю войну, встретил Победу, уволился в запас в 1946 г. и прожил ещё долгих 20 лет мирной жизни.



*Командир 159-го стрелкового полка Белов А.И.*
*(фото с портала  “Память народа”)*



*Командир 288-го стрелкового полка Кучмистый Г.П.*
*(фото с портала  “Память народа”)*

Все командиры полков 64-й стрелковой дивизии честно и мужественно выполняли свой долг перед Родиной. Широко бытует мнение, что “окруженцев” – бойцов и командиров, бывших в окружении противника, при удачном прорыве из него к своим ожидали только арест и “быстрый на расправу” военный трибунал, но никак не дальнейшая служба в рядах

Красной Армии и не, тем более, Правительственные награды. Однако, реальная картина того времени совершенно не поддаётся стереотипам, которые стремятся с ней связать. Ситуации и обстановка были различными: каждый конкретный случай имел свою развязку. Докажем это на реальном примере – судьбе командира 30-го стрелкового полка Александра Ивановича Ефремова.

Полковник Ефремов, прорвавшись со своими бойцами из немецкого окружения, не только не был арестован, но и сохранил своё воинское звание в рядах Красной Армии, а также был удостоен Правительственной награды – ордена Красного Знамени. Часто можно услышать о том, что Красной Армии летом 1941 г. было не до награждений – натиск немцев породил полный хаос и неразбериху, перед воинскими частями стояла единственная задача – не перестать существовать, не быть разбитыми совершенно. Однако, данное утверждение не отражает в полной мере реальную картину. Так, например, наградной лист на полковника Ефремова был подписан 26-го июля 1941 г. Даже в разгар тяжёлых боёв, как видите, время и возможность на это находились, значит, хоть обстановка и была сложной, не всё было исключительно драматично.

А теперь обратимся непосредственно к подвигу, за который Александр Иванович Ефремов был представлен к награждению орденом Красного Знамени. Из наградного листа следует: “В районе Казеки (Казеково, Юзуфовский с/с, Минский р-н – прим. авт.), когда противник превосходящими силами занял дорогу, т. Ефремов сам лично повёл батальон в атаку, показывая пример личной храбрости, контратаковал противника и восстановил прежнее положение. В этом бою было уничтожено большое количество пехоты противника…” Таким образом, полковник Ефремов и его бойцы не дали противнику прорваться к Минску с севера – южнее Казеково шла дорога на Минск, на которую рвались немцы. Судя по портретной фотокарточке, орден Красного Знамени за данный подвиг был действительно вручён Александру Ивановичу Ефремову: на его гимнастёрке два ордена Красного Знамени – первым он был награждён ещё в мирном 1928 г.

Из изложенного выше мы видим, как сложились военные судьбы командиров полков 64-й стрелковой дивизии, оборонявшей Минщину в июне 1941 г. Каждый из них был профессионалом своего дела и не жалел своей жизни ради спасения Отечества. Каждый из них достоин нашей памяти и уважения. Также мы видим и то, что реальная картина войны была очень многогранной, разбираться с которой необходимо, основываясь на проверенных фактах, не поддаваясь влиянию создаваемых разным

образом стереотипов, ведущих к искусственному упрощению, а значит – и искажению военной истории.

*старший научный сотрудник*
*ГУ “ИКМЗ “Заславль”*
*Игорь Кондратович*

*Литература*

1. Акалович, Н.М. Вперед, на Запад : (Очерки о мужестве и героизме советских воинов в годы Великой Отечественной войны) / Н.М. Акалович. – Мн. : Беларуская навука, 1998. – 254 с., 36 ил.
2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Заслаўя. – Мн. : БЕЛТА, 2000. – 464 с. : іл.
3. Информационная система “Память народа” Департамента Министерства обороны Российской Федерации по увековечению памяти погибших при защите Отечества.

**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў; выходзіць з мая 2020 г.

**Рэдкалегія: Сямашка К.У., Арцем'ева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.